# АЎТАРСКІЯ КАШТОЎНАСНЫЯ ЎСТАНОЎКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЮНАЦКАЙ АПОВЕСЦІ АПОШНІХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ

***В. М. Смаль***

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А. С. Пушкіна,*
*вул. Міцкевіча, 28, 224016, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь,*
*nika_smal@mail.ru*

Дадзены артыкул прысвечаны аналізу асаблівасцяў аксіялагічнай прасторы беларускіх празаічных твораў для юнага чытача. На прыкладзе юнацкіх аповесцяў апошніх дзесяцігоддзяў ахарактарызаваны аўтарскія каштоўнасныя ўстаноўкі, якія накіраваны на захаванне традыцыйных маральных каштоўнасцяў беларускага народа.

***Ключавыя словы:*** юнацкая аповесць; каштоўнасныя арыенціры; сучасная моладзь; маральны ідэал.

# AUTHOR'S VALUES IN THE BELARUSIAN YOUTH STORY OF THE LAST DECADES

***V. M. Smal'***

*Pushkin Brest State University,*
*28, Mitskevicha Str., 224016, Brest, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. N. Smal' (nika_smal@mail.ru)*

This article is devoted to the analysis of the features of the value space of Belarusian prose for young readers. Using the example of youth stories of recent decades, the author's values are characterized, which are aimed at preserving the traditional moral values of the Belarusian people.

***Key words:*** youth history; value orientations; modern youth; moral ideal.

Аўтарская пазіцыя ў мастацкім творы для юнага пакалення заўсёды арыентуе рэцыпіента на пэўныя каштоўнасныя ўстаноўкі. Пісьменнік у сваіх творах выяўляе светапоглядныя перакананні, у якіх мастак акцэнтуе ўвагу на важных надзённых праблемах і іх ролі ў жыцці чалавека.

Аўтарская пазіцыя дапамагае юнаму чытачу з яшчэ невялікім жыццёвым вопытам спасцігнуць галоўную ідэю твора і вынесці пэўныя жыццёвыя ўрокі. У аповесцях, адрасаваных юнацтву, аўтарскія каштоўнасныя ўстаноўкі дапамагаюць рэцыпіенту спасцігнуць свой унутраны свет, разабрацца ў нюансах чалавечых узаемаадносін. Гэта дапамагае маладому чалавеку на пераходным этапе да дарослаcці прайсці працэс псіхасацыяльнай ідэнтыфікацыі.

Светапогляд майстра слова ўплывае на фарміраванне ў літаратурным творы эстэтычнага ідэала. У гісторыі станаўлення і развіцця жанра аповесці для юнацтва аўтарская ідэя заўсёды была накіравана на фарміраванне маральна-духоўнай і патрыятычнай асобы. Аўтарскія каштоўнасныя арыенціры складваюцца і пад уплывам пэўнай гістарычнай і сацыяльнай рэальнасці. Заснавальнік юнацкай аповесці Якуб Колас у сваім творы «На прасторах жыцця» ужо ў назве адлюстраваў ідэю перспектыў для маладога пакалення ў паслярэвалюцыйнай рэальнасці. Якуб Колас дае чытачу прыклад ідэалу актыўнага чалавека, які імкнецца да ведаў, да стваральнай працы на карысць грамадства. Нездарма галоўныя героі аповесці Сцёпка і Аленка былі кумірамі не аднаго пакалення.

У перыяд актыўнага развіцця жанру аповесці для юнацтва ў 69–70 гг. XX ст. ў грамадстве панавала стройная сістэма маральна-каштоўнасных арыенціраў, якія актыўна прапагандаваліся і ў мастацкай літаратуры. На першым плане ў выхаванні савецкай моладзі стаялі такія паняцці як справядлівасць, сумленнасць, любоў да радзімы і г. д.

Пасля распаду Савецкага Саюза ў беларускім грамадстве ўсталяваўся пэўны нігілізм да савецкіх ідэалагічных установак. Пераасэнсаванне каштоўнасных арыенціраў у такой сітуацыі – з’ява натуральная і непазбежная, аднак разам з пазітыўнымі пераменамі акрэсліліся негатыўныя тэндэнцыі. У 80-90-я гг. XX ст. пачаў паступова разбурацца інстытут сям’і. Павевы розных «свабод» з захаду ў пераважнай большасці не прыжыліся ў нашай краіне, у многім дзякуючы клопату дзяржавы аб выхаванні падрастаючага пакалення. Аднак розныя негатыўныя тэндэнцыі праявіліся ў бытавым і грамадскім жыцці: разгульны лад жыцця, панаванне спажывецкіх інтарэсаў і г. д. На гэтыя негатыўныя тэндэнцыі аўтары аповесцяў для юнацтва аператыўна адгукнуліся.

У аповесці «Ведзьміна тоня» В. Гапеева паказана, як безадказнасць прыводзіць да маральнай дэградацыі. Галоўны герой апынуўся «на дне» жыцця з-за п’яніцы маці. Амаль з нараджэння і да 14 гадоў Сяргей выму-

шаны быў выжываць фізічна і маральна. З кляймом непаўнавартаснасці ён быў нікому непатрэбны. Смерць бацькі ніяк не апраўдвала непрабуднае п'янства і адсутнасць клопату пра дзяцей. У віры неспрыяльных умоў жыцця юнак змог знайсці апору жыцця і не стаць крымінальнікам. Менавіта юны Сяргей узяў адказнасць за лёс маленькай сястрычкі. Барацьба з нягодамі жыцця не засталася па-за ўвагай аднавяскоўцаў. Вырашэнне праблем Сяргея і яго сястрычкі стала для многіх аднавяскоўцаў урокам чалавечнасці. Людзі зразумелі, што сітуацыя, у якой апынуліся дзеці, у многім склалася «дзякуючы» іх абыякавасці да юных гаротнікаў. У гэтым творы, як і ў многіх іншых, адрасаваных маладому пакаленню, В. Гапееў выступае за сямейныя каштоўнасці. Ён сцвярджае, што моцная маральнымі традыцыямі сям'я – гэта аснова фарміравання асобы маладога чалавека.

Не менш праблемнай стала аповесць «Прынцэса з тусоўкі» Я. Хвалея. Плынь псеўдакультурных ідэалагічных установак маладзёжных субкультур постсавецкай эпохі дэфармавала псіхіку маладога пакалення. Галоўная гераіня Таня расла эгаісткай, бо ў сям'і панавала спажывецкая мараль. У Тані не было маральных прынцыпаў, акрамя жадання быць лепшай дзяўчына – прынцэсай. Але яе дарагая вопратка не прываблівала равеснікаў, бо ў душы яе была пустата. Аўтарскі ідэал у аповесці выяўляецца праз духоўную прыгажосць чалавека. Эгаізм і жаданне выдзеліцца прыводзяць дзяўчыну на крымінальны шлях, а ў далейшым за краты. Я. Хвалей пераканана даводзіць, што дэфармацыя характару Тані адбылася з-за адсутнасці выхавання ў сям'і, у якой замест маралі была толькі матэрыяльная выгода.

Адна з актуальных праблем сучаснага грамадства – уплыў віртуальнай рэальнасці на псіхасацыяльнае станаўленне моладзі. Гэта праблема не засталася па-за ўвагай сучасных мастакоў слова. У аповесці «Лёшкава каханне, або віртуальнае дрэва кахання» В. Гапееў паказаў дэфармацыю свядомасці юнака пад уплывам віртуальнай рэальнасці. Сусветнае павуцінне замяніла Лёшку стасункі з рэальнымі людзьмі. Гэта прывяло да падмены жыццёвых арыенціраў з рэальных на віртуальныя. Галоўны герой пад уплывам віртуальнай рэальнасці апынуўся ў палоне ілюзій, што перапыніла яго працэс сацыялізацыі. Гэта прывяло да псіхалагічнага крызісу і расчаравання.

Разам з паказам крызісных сітуацый у пераходным узросце мастакі слова дэманструюць разуменне праблем сучаснай моладзі, якая імкнецца сцвердзіцца, і хоча, каб яе разумелі і прымалі як асобу.

Найбольш аб'ектыўна і рознапланава жыццё моладзі паказана ў сучасных аповесцях для юнацтва «Інстынкт, або Прысак кахання і жарства пакут» А. Бутэвіча, «Урокі першага кахання», «Мая мілая ведзьма» В. Гапеева. Усё гэта сведчыць, што аўтарскія каштоўнасныя арыенціры ў сучасных юнацкіх аповесцях накіраваны ў першую чаргу на фарміраванне ў моладзі здаровай і пазітыўнай маралі на аснове спрадвечных беларускіх каштоўнасных дамінант.